

# НАВУМАВА ЛІДЗІЯ АНДРЭЕЎНА

**(1933-2022)**

**Герой Сацыялістычнай Працы**



Навумава Лідзія Андрэеўна нарадзілася 04.04.1933 г. у в. Нова-Беліца Гомельскага раёна (цяпер у рысе Гомеля).

Закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 1957-1962 гадах працавала аграномам калгаса “XVIII партз’езд”, з 1962 года – старшыня калгаса “Перамога” (пасля ўзбуйнення – калгас імя Леніна) Талачынскага раёна. Пад яе кіраўніцтвам калгас “Перамога” з году ў год ішоў па шляху эканамічнага росквіту. У тым, што стаяла за поспехам Лідзіі Навумавай як кіраўніка, асабіста пераканаўся першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў. А стаяла тое, што можна было ўбачыць у характары гэтай тераічнай жанчыны: глыбокае мысленне, востры аналітычны розум, працавітасць і павага да чалавека, а таксама непарыўная сувязь з каранямі і зямлёй.

Пачынаючы з 1966 года гаспадарка 6 разоў выходзіла пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва, у 1970 годзе ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і УЦСПС. У 1977 годзе Л.А. Навумава ўзначаліла найбуйнейшы калгас у Талачынскім раёне – імя Леніна, у склад якога быў ўключаны і калгас “Перамога”. За 10-ю пяцігодку сярэднегадавая ўраджайнасць збожжавых склала 28,9 цэнтнера, бульбы – 192 цэнтнера, ільновалакна – 7,9 цэнтнера з гектара, інтэнсіўна развівалася свінагадоўчая галіна.

Узнагароды:

ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (23.11.1966);

ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі (27.12.1976);

ордэн Дружбы народаў;

ордэн “Знак Пашаны”;

медалі ВДНГ СССР.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы (медаль “Серп і молат” і ордэн Леніна) прысвоена ў 1971 годзе за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні плана продажу дзяржаве прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Член ЦК КПБ в 1971-1976гг.

Ганаровы грамадзянін Талачынскага раёна (2010).

**Літаратура:**

1. Абрамовіч, С. Светлыя і добрыя пажаданні : з вышыні пражытага / Сяргей Абрамовіч // Наша Талачыншчына. – 2011. – 2 ліпеня. – С. 2. *(Успаміны Л.А. Навумавай).*

2. Бірукоў, В. Поле жыцця Лідзіі Навумавай / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. – 2003. – 15 сакавіка. – С. 2.

3. Бирюков, В. Простое, обыкновенное, земное счастье / Виктор Бирюков // Наша Талачыншчына. – 2013. – 30 сакавіка. – С. 2. – (Дата в жизни и судьбе).

4. Бирюков, В. Сила созидания: человек-эпоха / Виктор Бирюков // Витебские вести. – 2021. – 29 апреля. – С. 5.

5. Наумова Лидия Андреевна, председатель колхозв // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биогр. справ. / сост. И.Н. Кулан [и др.] ; под общ. ред. А.Н. Новикова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 164.

6. Павлов, М. “Судьбы моей простое полотно” / Михаил Павлов // Наша Талачыншчына. – 2018. – 31 сакавіка. – С. 5.

7. Скапа, У.Р. Старшыня калгаса // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. : І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1988. – С. 608-609.

8. Скопа, В. Двадцать первая весна. // Знаменосцы трудовой славы / сост. Г.С. Гужва, В.Г. Скопа, Е.Я. Рыклин. – Минск : Беларусь, 1984. – С. 231-235.

9. Телятко, Е. И это всё о ней… / Е. Телятко // Віцебскі рабочы. – 2008. – 5 красавіка. – С. 9.

10. Шнейдер, А. Высота Лидии Наумовой / Анатолий Шнейдер // Белорусская нива. – 2008. – 3 апреля. – С. 2.

**Інтэрнэт-рэсурсы:**

1. Герой Социалистического Труда Наумова Лидия Андреевна : Герои страны. Международный патриотический интернет-проект : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : rtg.warheroes.ru›hero/hero.asp?Hero_id=21369

2. Знаменитые люди Толочинского района : Толочинский районный исполнительный комитет : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : tolochin.vitebsk-region.gov.by.